виями такого рода: «Каждый серьезный анализ культуры начинается опять с самого начала и заканчивается там, куда удается добраться, прежде чем будет исчерпан интеллектуальный импульс» [1, с. 34].

1. *Гирц, К.* Интерпретация культур / Клиффорд Гирц. – М. : Росспэн, 2004. – 557 с.

2. *Кун, Т. С.* После «Структуры научных революций» / Томас Кун ; пер. с англ. А. Л. Никифорова. – М. : АСТ, 2014. – 443 с. – (Новая философия).

3. *Никишенков, А. А.* История британской социальной антропологии / А. А. Никишенков. – СПб. : Изд-во Санкт-Петерб. ун-та, 2008. – 494 с.

4. *Риккерт, Г.* Науки о природе и науки о духе / Г. Риккерт // Логика культуры. Антология. – СПб., 2009. – С. 67–99.

***Г. У. Махнач,*** *кандыдат тэхнічных навук, дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры;*
***С. А. Ганчарова,*** *кандыдат тэхнічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры інфармацыйных тэхналогій у культуры*

## АДЛЮСТРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ ФАЛЬКЛОРНАЙ СПАДЧЫНЫ СРОДКАМІ МЕНТАЛЬНЫХ КАРТ

Ментальныя карты трывала ўвайшлі ва ўжытак даследаванняў самых розных навук і галін дзейнасці ад сацыялогіі да архітэктуры, ад псіхалогіі да планавання і кіравання [2]. У цяперашні час, са з’яўленнем вялікай колькасці адпаведных вэб-сервісаў сеткі Інтэрнэт і хмарных сховішчаў, метад ментальных карт перажывае другое нараджэнне, выяўляючы ўсё новыя грані і магчымасці выкарыстання. Гэта адбываецца на фоне росту папулярнасці разнастайных практык візуалізацыі даных. Ментальныя карты дазваляюць даследчыку сфакусавацца на галоўным у той інфармацыі, з якой ён працуе, развіваюць у яго навыкі сістэмнага мыслення, дазваляюць ствараць лаканічныя спецыфікацыі, візуалізуюць уяўленні аб прадмеце, які даследуецца. На сённяшні дзень ментальныя карты – адзін з самых перспектыўных метадаў у працэсе збору, структурыравання інфармацыі і яе эфектыўнай апрацоўцы. У метадалагічным плане тут цалкам дамінуе даследчая рамка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэферэнцыі: даследчык вызначае, што будзе фіксавацца, з якой мэтай і якімі выяўленчымі сродкамі.

У аснове методыкі інтэлект-карт, прапанаванай Тоні Бьюзенам [1], ляжаць уяўленні аб прынцыпах працы чалавечага мозгу: асацыятыўнае мысленне, візуалізацыя разумовых вобразаў і цэласнае ўспрыманне. Структурыраванне інфармацыі ажыццяўляецца за кошт добра развітых сродкаў арганізацыі асацыятыўных сувязяў (як лінейна-паслядоўнага, так і радыяльнага выкладу) паміж кампанентамі ментальнай карты, што дае магчымасць ў адным дакуменце аддзяліць галоўную інфармацыю ад падрабязных тлумачэнняў і ўсталяваць складаныя іерархічныя сувязі.

Ментальныя карты – гэта даследчы метад і, адначасова, прадукт прымянення гэтага метаду. Менавіта мэта стварэння дазваляе адрозніваць уласна ментальныя карты ад аднайменнай тэхнікі індывідуальнага самаразвіцця (званай таксама інтэлект-картамі), прызначанай для развіцця памяці, індывідуальнага самавыяўлення, структурыравання уяўленняў графічным чынам [1].

Як усякі метад, ментальныя карты валодаюць вядомай універсальнасцю – кола ўжывання ментальных карт для даследавання імкліва пашыраецца.

Дастасавальныя ментальныя карты і да прадстаўлення фальклорнай спадчыны, якой уласціва варыятыўнасць і сінкрэтычнасць. Зараз асноўнай формай яе фіксацыі з’яўляецца тэкставая (з дадатковым аудыявізуальным матэрыялам). Калі для прадстаўлення аднаго жанра фальклора гэтага звычайна амаль дастаткова, то пры падрабязнай фіксацыі складаных комплексаў (абрадаў, святаў і інш.), якія ўтрымліваюць у сабе ўзоры песеннага, харэаграфічнага, драматычнага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, узнікаюць цяжкасці.

Яшчэ адна асаблівасць навукова-апрацаванага фальклорнага матэрыялу заключаецца ў неабходнасці прадстаўлення яго трыма кампанентамі: структурнай паслядоўнасцю сюжэтных марфем складнікаў, змястоўным іх тлумачэннем і навуковай трактоўкай. Два апошнія кампаненты ўтвараюць як бы дзве паралельныя лініі выкладання – фальклорную і навуковую. Пры традыцыйным лінейным выкладзе гэтыя лініі пераплятаюцца і тэкст становіцца складаным для ўспрымання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ментальныя карты дазваляюць перадаць структурную і мастацкую цэласнасць фальклорнага твора (падання, абраду і г. д.), эфектыўна арганізаваць скрутак, тлумачэнне і сувязі паміж фальклорнымі тэкстамі, правесці гісторыка-навуковы і храналагічна-рэгіянальны аналіз [3].

Ментальныя карты акумулююць усе віды інфармацыі: тэкставаю, гукавую, лікавую, графічную, гіпертэкставую і дазваляюць у адным дакуменце ўсталяваць неабходныя суадносіны паміж этнаграфічным матэрыялам рознай прыроды. Разгледзім прымяненне такога спосабу на канкрэтных прыкладах – прадстаўленні абраду «Каляды» і свята «Багач» з дапамогай вэб-сервісу Mindjet MindManager 9 [4].

Дамовімся да фальклорнага ўзроўню адносіць звесткі, атрыманыя збіральнікам пры апытанні насельніцтва. А да навуковага ўзроўню адносіць звесткі, атрыманыя даследчыкам шляхам апрацоўцы фактычнага матэрыялу (аналізу, супастаўленняў, абагульненняў і г. д.).

На мал. 1 адлюстраваны розныя ўзроўні паняццяў у адпаведнасці з структурай дзеянняў, якія здзяйсняюцца ў абрадзе, а таксама прыклад фармальнага далучэння да структуры фальклорнага ўзроўню (націснуць кнопку «Нататкі» ) і навуковага узроўню (націснуць кнопку «Каментары» ) прадстаўлення абраду.




*Мал. 1.* Тры куцці – змест фальклорнага ўзроўню

На мал. 2 паказана структураванне, падпарадкаванне і спалучэнне розных відаў медыякантэнту ў межах адной карты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Розныя піктаграмы побач са структурнымі элементамі – складнікамі свята – сведчаць аб выглядзе этнаграфічнага матэрыялу і з'яўляюцца кропкамі пераходу да яго прагляда. Прагляд ажыццяўляецца ў прасторы ментальнай карты і не патрабуе асобнага прыкладнога праграмнага забеспячэння.

Прыведзеныя прыклады дэманструюць працэс размяшчэння навукова апрацаваных фальклорных матэрыялаў у ментальнай карце. Такім чынам, сюжэтныя марфемы дадаюцца ў карту з дапамогай інструмента «Тэма», фальклорныя тлумачэнні – з дапамогай інструмента «Нататкі», а навуковыя тлумачэнні – з дапамогай інструмента «Каментары».




*Мал.* 2. Прыклад ужывання ментальных карт для прадстаўлення абрада «Багач». Спалучэнне розных відаў інфармацыі ў адной карце

Зараз існуе больш за 200 спецыялізаваных праграм і інтэрнэт-сервісаў для пабудовы і рэдагавання электронных ментальных карт [4]. Самыя развітыя з іх валодаюць супастаўнымі магчымасцямі і задавальняюць прыведзеным асаблівасцям прадстаўлення навукова-апрацаванага фальклорнага твора. А менавіта, прымяненне вэб-сэрвісаў ментальных карт у даследчым і асветніцкім працэсах дазваляе:

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– выконваць дакладнае структураванне і атрымліваць цэласнае ўспрыманне прадметнай вобласці;

– у адным файле захоўваць інфармацыю living рознай прыроды, прымацоўваць файлы любых фарматаў, папкі і спасылкі;

– даюць магчымасць сістэмнага бачання сітуацыі і магчымасць пераключацца паміж любымі кавалкамі этнаграфічнага матэрыялу;

– ствараць мультымедыйны тэкст у каментарах;

– аснашчаць «Тэмы» некалькімі каментарамі;

– арганізаваць анлайнавую калектыўную працу і збор даных;

– экспартаваць ва ўсе распаўсюджаныя фарматы і друкаваць.

Вэб-сэрвісы ментальных карт не патрабуюць інсталяцыі, а самыя прасунутыя з іх інтэграваны з прыкладаннямі Microsoft Office (Microsoft Word, Microsoft PowerPoint, Microsoft Project і інш.), Internet Explorer, Adobe Acrobat Reader, што дазваляе варыятыўна прадстаўляць вынікі працы.

Напрыканцы варта адзначыць, што электронныя ментальныя карты, створаныя з дапамогай інтэрнэт-сэрвісаў, дазваляюць практычна без дадатковых выдаткаў арганізаваць карпаратыўную працу па цэнтралізаваным зборы, навуковай апрацоўцы і захаванні фальклорнага спадчыны па ўсёй тэрыторыі краіны.


1. *Бьюзен, Т.* Супермышление / Т. Бьюзен, Б. Бьюзен ; пер. с англ. – Минск : Попурри, 2008. – 304 с.

2. *Веселкова, Н. В.* Ментальные карты города: вопросы методологии и практика использования (Социология: 4М) / Н. В. Веселкова. – 2010. – № 31. – С. 5–29.

3. *Махнач, Г.* Выкарыстанне ментальных карт для навуковай апрацоўкі фальклорнага матэрыялу / Г. Махнач, С. Ганчарова // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў VII Міжнар. навук. канф., Мінск, 26–28 крас. 2013 / БДУКМ ; рэдкал.: В. Р. Языковіч (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 41–44.

*4.* 99 Mind Mapping Resources, Tools, and Tips / Online College Degrees for Today's Student [Электронный ресурс]. – Mode of access : http://www.collegedegree.com/library/college-life/99-mind-mapping. – Date of access : 20.12.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ